# Пазнавальны праект
# «Я – піянер! Радзімай ганаруся! За крокам крок іду да Беларусі!»

для членаў дзіцячай палаты Кастрычніцкай раённай піянерскай арганізацыі горада Гродна

**Гродна 2022**

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!




Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!



Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!

Згодна з летапісамі, **Камянецкая вежа** ўзведзена паміж 1276 і 1288 гадамі па загадзе галіцка-валынскага князя Уладзіміра Васількавіча. У XIV-XVII стагоддзях вежа вытрымлівала набегі крыжаносцаў, штурмы войскаў польскіх і літоўскіх князёў, каля яе сцен змагаліся арміі Рэчы Паспалітай, Швецыі і Маскоўскай дзяржавы. Сёння **сілуэт Камянецкай вежы** – адзін з самых вядомых архітэктурных сімвалаў Беларусі, а словазлучэнне "Белая вежа" ператварылася ў сапраўдны брэнд. Аднак многія стагоддзі вежа ў Камянцы не называлася Белай вежай. Гэта адбылося толькі ў XX стагоддзі, калі аўтар кнігі **"Белавежская пушча"** Георгій Карцоў памылкова напісаў, што вежа размешчана на рацэ Белая. Сёння гісторыкі лічаць, што існавала іншая вежа, якая дала назву Белавежскай пушчы.

Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!



## Раздел 4.
## «Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Троіцкі касцёл у сучасным выглядзе быў пабудаваны ў Гервятах у 1903 годзе на месцы драўлянага будынка 1526 года. Над стварэннем касцёла ў сучасным выглядзе працавалі архітэктар Альшалоўскі і дойлід Міхневіч, фінансаваў знакавую падзею князь Альшэўскі. Сёння Троіцкі касцёл у Гервятах з'яўляецца рэкардсмэнам адразу па некалькіх пазіцыях. Па-першае, будынак уваходзіць у тройку самых высокіх храмаў Беларусі – яго вышыня дасягае 61 метра. Па другой версіі – 64 метраў. Параўнаць такія памеры можна з 20-павярховым домам.

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!



Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

## Свята-Барыса-Глебская Каложская царква

не падобная ні на адзін храм у свеце. Праваслаўная святыня ўключана ў папярэдні спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Дакладная дата пачатку будаўніцтва невядома, але мяркуюць, што мураваная царква на крутым беразе ракі Нёман у Гродне была ўзведзена ў 1140-1170 гады. Сыны Гродзенскага князя Усевалада заснавалі храм у гонар першых старажытнарускіх святых – князёў Барыса і Глеба. Яшчэ адну назву царквы, якая стала больш знакамітай – Каложская – звязваюць з урочышчам Калажань у Гродне, на якім і быў пабудаваны храм. Слова "калажань" у старажытнарускай мове азначала месца, дзе б'юць крыніцы.

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!



Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

**Я – піянер! Радзімай ганаруся!**
**За крокам крок іду да Беларусі!**

Мірскі замак быў закладзены ў пачатку XVI стагоддзя князем Іллінічам. У 1568 годзе замак перайшоў у валоданне Мікалая Радзівіла, які дабудаваў яго ў стылі рэнесансу. Уздоўж усходняй і паўночнай сцен замка быў пабудаваны трохпавярховы палац. Вакол узведзены земляныя валы з бастыёнамі на вуглах і ровам з вадой. У паўночнай частцы разбіты сад у італьянскім стылі. Штучнае возера было створана на поўдні.

У час Напалеонаўскіх войнаў замак сур'ёзна пацярпеў і стаяў у запусценні больш як стагоддзе. Усё яшчэ знаходзячыся ў руках багатай сям'і Радзівілаў, ён быў адноўлены ў пачатку XIX стагоддзя і прададзены Мікалаю Святаполк-Мірскаму ў 1895 годзе. Яго сын пачаў аднаўленне замка, якое праходзіла пад кіраўніцтвам архітэктара Тэадора Буршэ.

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!



## Раздел 4.
## «Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!

Узнікненне ў Нясвіжы мураванага замка звязана з дзейнасцю Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі.
Работы пачаліся ў 1582–1583 гг. і ў асноўным былі скончаны да 1600 г. У 1660 г. крэпасць вытрымала двухмесячную аблогу маскоўскага войска, што істотна паўплывала на ход вайны. Нясвіж адцягнуў на сябе частку непрыяцельскіх аддзелаў ад Ляхавічаў і адвёў пагрозу ад Слуцка.
Падчас Паўночнай вайны, у 1706 г., да замка падыйшло шведскае войска на чале з Карлам XII. Шведы разрабавалі замак і цалкам знішчылі яго ўмацаванні: валы былі раскапаныя, бастыёны ўзарваныя, будынкі спаленыя.
Аднаўленне пачалося ў 1720-я гг. ў часы Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі. Адбудаваны палац, карпусы арсенала і камяніцы былі злучаны галерэямі ў адно цэлае. У палацы была абсталявана адмысловая Тэатральная зала, капліца іконы Ларэтанскай Божай Маці, нейкі час дзейнічала друкарня. Тут знаходзіліся багатая бібліятэка, партрэтная галерэя, калекцыі зброі і даспехаў, манет і медалёў. У 1784 г. адмыслова да прыезду караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага была створана Каралеўская зала, упрыгожаны шэраг пакояў.

Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!



## Раздел 4.
## «Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!

Храм узведзены ў сярэдзіне XIX стагоддзя шляхціцам Ігнатам Лапацінскім, былым Сар'янскім землеўладальнікам, у памяць яго горача каханай жонкі Марылі, якая рана пайшла з жыцця. У 1865 г. касцёл быў канфіскаваны ўладамі «за хараство» (*«за великолепие»*) і перададзены праваслаўным. У 1935 годзе храм быў зачынены, пасля Другой сусветнай вайны будынак выкарыстоўваўся як склад, пазней — як забаўляльная ўстанова. У 1989 годзе храм вярнулі каталікам, але ў 1990 годзе ён быў зноў перададзены праваслаўнаму прыходу Успення Прасвятой Багародзіцы

Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!



Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

## Я – піянер! Радзімай ганаруся!
## За крокам крок іду да Беларусі!

Вандалін Пуслоўскі, вядомы прамысловец і аматар мастацтваў, у 1838 годзе пачаў у Косаве будаўніцтва раскошнага палаца. Кожная вежа сімвалізавала месяц года, пры гэтым 4 цэнтральныя – у гонар ураджайных мая, чэрвеня, ліпеня і жніўня – самыя высокія. У палацы больш за 100 памяшканняў, і ніводнага прахаднога. Дзякуючы сістэме калідораў і асабліваму размяшчэнню вокнаў, на працягу двух з палавінай дзён за год сонечнае святло поўнасцю залівала адзін з пакояў. У гэты час гаспадары святкавалі Дзень пакоя. Косаўскі палац славіўся раскошнымі заламі: у Белай – госці танцавалі на шумных балях, у Чорнай – гулялі ў карты, у Ружовай – музіцыравалі. Кажуць, што была і зусім дзіўная для таго часу Парадная зала, дзе непасрэдна пад шкляной падлогай сярод водарасцей плавалі рыбкі. Сучасныя рэстаўратары гэты факт яшчэ не пацвердзілі, але ўпэўнены: падлогі з падагрэвам дакладна былі. Палац быў акружаны цудоўным паркам, дзе раслі больш за 150 відаў экзатычных раслін, а для асабліва рэдкіх экзэмпляраў была ўладкавана аранжарэя. Парк маляўніча спускаўся да трох штучных азёр і сядзібы Касцюшкі. Успамінаюць  і "музычную" асаблівасць палаца. Калі на другім паверсе ўсходняга боку, стаўшы на падаконнік, нехта гучна пляскаў у далоні, скляпенні будынка пачыналі выдаваць меладычныя гукі.

**Раздел 4.**
**«Архітэктурныя помнікі Беларусі»**

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!



Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Каталіцкі кафедральны сабор Святога Францішка Ксаверыя будаваўся з 1678 года і па 1703 год, быў урачыста асвечаны 6 снежня 1705 года біскупам Тэадорам Патоцкім у прысутнасці караля Аўгуста II і цара Пятра I.

Галоўны фасад храма ўпрыгожваюць дзве велічныя і вельмі прыгожыя вежы, якія былі ўзведзены з 1750 па 1752 год. У 1725 годзе ў паўночнай вежы касцёла быў усталяваны механічны вежавы гадзіннік, які раней знаходзіўся ў вежы гарадской ратушы. Гадзіннік гэты адзін з найстарэйшых дзеючых вежавых гадзіннікаў ва Усходняй Еўропе.

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!



Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!

Мураваны сабор у Полацку з'явіўся пасля сваіх "старэйшых сясцёр" у Кіеве і Ноўгарадзе, пабудаваных па ўзоры сабора ў Канстанцінопалі, і стаў чацвёртым у свеце храмам Святой Сафіі.

Грэчаскае слова "сафія", што азначае "мудрасць, майстэрства", палачане тлумачылі шырэй – як вялікую чалавечую агульнасць, праяву адзінства жыхароў княства.

Упершыню храм згадваецца ў «Жыцці прападобнай Ефрасінні Полацкай» і «Слове пра паход Ігараў» XII стагоддзя.

Велічнае збудаванне ўзводзілі візантыйскія майстры і гараджане ў 1044 – 1066 гадах па распараджэнні князя Усяслава Чарадзея.

У час Паўночнай вайны па загадзе Пятра I сабор выкарыстоўваўся як склад амуніцыі і боепрыпасаў, а пасля выбуху ў 1710 годзе быў значна разбураны.

Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!



Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Я – піянер! Радзімай ганаруся!
За крокам крок іду да Беларусі!

Царква з'яўляецца помнікам Полацкай школы дойлідства. Будаўніком быў майстар Іаан. Царква захавалася амаль цалкам, пэўныя перабудовы адбыліся толькі ў верхняй частцы.

Асаблівую гістарычна-мастацкую каштоўнасць маюць фрэскавыя роспісы XII ст. — унікальны твор манументальнага мастацтва сусветнай значнасці. Спаса-Ефрасіньеўская царква з яе роспісамі прызнана гісторыка-культурнай каштоўнасцю Рэспублікі Беларусь. У 1161 годзе на гэты храм Ефрасіння ахвяравала пазалочаны напрастольны крыж, што вядомы як Крыж Ефрасінні Полацкай. У 1921 г. манастыр быў зачынены, крыж рэквізаваны, у 1928 г. перавезены ў Мінск, у 1929 — у Магілёў. У 1941 падчас Вялікай Айчыннай вайны Крыж Ефрасінні Полацкай бясследна знік і дагэтуль не знойдзены.

Раздел 4.
«Архітэктурныя помнікі Беларусі»

Дзякуй за ўвагу!